УДК 351.853.3+904:726.82(476.5)«13/17»
**В.У. ЧАРАЎКО**
Беларусь, Полацк, ПДУ

## КЕРАМІКА ПОЗНЕСЯРЭДНЯВЕЧНАГА МОГІЛЬНІКА ДОЎГАЕ ЯК СВЕДЧАННЕ ПАМІНАЛЬНАГА АБРАДУ

Помнікі XIV–XVIII стст. у археалогіі называюцца познесярэднявечнымі [5, с. 340]. Недастаткова даследаванай катэгорыяй археалагічных аб'ектаў з'яўляюцца познесярэднявечныя пахаванні. Іх адрознівае амаль поўная безынвентарнасць, якая ўскладняе не толькі вывучэнне пахавальна-памінальнай практыкі, але і датаванне могільнікаў [7, с. 176–177, 181; 14, с. 6]. Аднак, безынвентарнасць не азначае абсалютнай адсутнасці рэчаў у межах пахавальнага помніка. Яна азначае адсутнасць той катэгорыі рэчаў, якія вызначаюцца як пахавальны інвентар [14, с. 6].

Пахавальны інвентар – прадметы, што былі пакладзены ў пахаванне разам з памерлым: асабістыя рэчы, ежа і г.д. [10, с. 196]. Артэфакты, выяўляемыя ў межах пахавальнага помніка па-за пахаваннем, называюцца пазамагільным інвентаром [6, с. 67]. Пры даследаванні познесярэднявечных могільнікаў Беларускага Падзвіння ў верхніх пластах культурнага слою часта выяўляецца кераміка. Наяўнасць фрагментаў сценак, донцаў і венцаў керамічнага посуду адзначана на познесярэднявечных могільніках каля в. Новы Болецк Гарадоцкага раёна (раскопкі В.М. Ляўко), в. Туржэц 2 Полацкага раёна (раскопкі Дз.У. Дука), в. Івесь і в. Доўгае Гарадоцкага раёна, в. Жарнасекава і в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна, в. Дубраўка Гарадоцкага раёна (раскопкі аўтара) [3, с. 265; 9, с. 137; 14, с. 7].

Наяўнасць каля в. Доўгае старога грунтовага могільніка з каменнымі надмагіллямі, «дзе пахаванні адбываліся ад часоў сярэднявечча да сённяшняга

дня», адзначыла Л.У. Дучыц [4, с. 111]. У 2010 і 2015 гг. на могільніку намі праводзіліся археалагічныя даследаванні. Агульная ўскрытая плошча склала 77 м$^2$. Было даследавана 31 пахаванне [12; 13].

Пахавальны інвентар адсутнічаў цалкам. Пазамагільны інвентар быў прадстаўлены манетай («денгой» Расійскай імперыі 1743 г.) і фрагментамі керамічнага посуду (44 адзінкі). Увесь пазамагільны інвентар быў выяўлены ў пласце 1 на глыбіні да 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні [13, с. 176–177]. З керамічнага матэрыялу ўвагі заслугоўвае развал керамічнага начыння непасрэдна пад камянямі, што ўтваралі падножжа-«падмурак» каменнага крыжа 1. Дзевяць фрагментаў начыння (у т.л. 3 фрагменты венца і 6 – сценкі) далі амаль поўны профіль гаршка XV–XVI стст. [12, с. 133]. Адносна вялікая колькасць размешчаных побач фрагментаў аднаго начыння дазваляе меркаваць, што яны трапілі ў зямлю непасрэдна ў час пабудовы надмагільнай канструкцыі.

Акрамя пазначанага развала гаршка ў межах ускрытай плошчы выяўлена яшчэ 33 адзінкі керамікі, у тым ліку фрагмент венца міскі XIV–XV стст. і гаршка XV ст. [13, с. 176–177]. Керамічны матэрыял і манета дазваляе вызначыць перыяд функцыянавання даследаванай часткі могільніка ў межах XV–XVIII стст. Каштоўнасць выяўленага керамічнага матэрыялу не вычэрпваецца яго значэннем для датавання могільніка. Фрагменты гліняных гаршкоў указваюць на ажыццяўленне на могільніку пэўных устойлівых дзеянняў. Да месца тут будзе прыгадаць этнаграфічна зафіксаваныя ў XIX–XXI стст. абрады памінання нябожчыка. Так, ужо на наступны дзень пасля пахавання родныя маглі памінаць памерлага на могілках у ходзе абраду «трацiны» [2, с. 32–33; 8, с. 414]. На працягу года пасля пахавання здзяйсняўся абрад «прыкладзінаў», які ўключаў упарадкаванне магілы і памінкі на могілках. Упарадкаванне магілы магло прымяркоўвацца да восеньскіх Дзядоў або Радаўніцы [1, с. 148–149, 152; 8, с. 415–416]. Пры гэтым на могілках пакідаліся рытуальныя стравы і посуд [11, с. 94].

Выяўленыя ў ходзе раскопак фрагменты керамікі суадносяцца з зафіксаванай у XIX–XXI стст. практыкай памінання памерлага на могілках і могуць быць патлумачаны наяўнасцю аналагічнай практыкі ў XVI ст. Не выключана, што фрагменты керамікі пад падножжам каменнага крыжа 1 трапілі ў культурны слой якраз у час «прыкладзінаў».

Такім чынам, у ходзе археалагічных раскопак 2010 і 2015 гг. на могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна было даследавана 31 пахаванне, пазначанае каменнымі надмагіллямі. Пахаванні былі безынвентарныя. Сярод пазамагільнага інвентару пераважалі фрагменты керамікі (44 адзінкі). Падобная з'ява назіраецца на шэрагу іншых познесярэднявечных могільнікаў Беларускага Падзвіння. Наяўнасць керамікі ў верхнім пласце культурнага слою суадносіцца з этнаграфічна зафіксаванай практыкай памінання памерлага на могілках у ходзе «трацін», «прыкладзінаў», Радаўніцы, восеньскіх Дзядоў, калі на могілках пакідаліся рытуальныя стравы і посуд. Знойдзеная кераміка з'яўляецца памінальным інвентаром і археалагічна пацвярджае, што памінальны абрад, этнаграфічна апісаны ў XIX–XXI стст., існаваў на Беларускім Падзвінні ў XV–XVI стст.

(Работа выканана ў рамках НДР «Фарміраванне антрапалагічнага складу і адаптыўнага статуса насельніцтва Полацкага Падзвіння ў XI–XIX стст.» у межах задання 1.1.02 «Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў IX – пачатку XXI ст.: крыніцазнаўства, гістарыяграфія, антрапалогія і іншыя спецыяльныя даследаванні» ДПНД «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг.)

1. Аўсейчык, У. Я. Абрад «прыкладзіны» ў беларусаў Падзвіння / У. Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. II Міжнар. навук. канф. (да 20-годдзя археал. і этнагр. экспедыцый ПДУ), Полацк, 17–18 крас. 2014 г. : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 1. – С. 144–156.

2. Аўсейчык, У. Я. «Прыватная» (індывідуальная) памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння (па матэрыялах канца XX – пачатку XXI стагоддзяў) / У. Я. Аўсейчык // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2015. – № 9. – С. 31–37.

3. Дук, Д. У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – № 15. – С. 261–269.

4. Дучыц, Л. Курганны могільнік Зябкі – Доўгае / Л. Дучыц // Гіст.-археал. зб. – 2001. – № 16. – С. 111–114.

5. Калядзінскі, Л. У. Сярэдневякоўе / Л. У. Калядзінскі // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Л–Я / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – С. 340.

6. Квятковская, А. В. Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII вв.). / А. В. Квятковская. – Вильнюс : Diemedžio, 1998. – 327 с.

7. Климов, М. В. Погребальные памятники полоцкой округи XIII–XVIII вв. / М. В. Климов, В. В. Черевко // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Беларус. навука, 2012. – С. 176–182.

8. Лобач, У. А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 510 с.

9. Ляўко, В. М. Новы Болецк / В. М. Ляўко // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Л–Я / рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – С. 137.

10. Погребальный инвентарь // Археологический словарь / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990. – С. 196.

11. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: гісторыка-культуралагічны аспект / склад. і агул. рэд. В. І. Мішынай. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 220 с.

12. Чараўко, В. У. Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна ў 2010 г. / В. У. Чараўко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 крас. 2011 г. : у 2 ч. / пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 130–134.

13. Чараўко, В. У. Археалагічныя раскопкі на могільніку каля вёскі Доўгае Глыбоцкага раёна ў 2015 г. / В. У. Чараўко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. III Міжнар.

навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г. : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2016. – Ч. 1. – С. 170–177.

14. Черевко, В. В. Поминальный инвентарь сельских погребальных памятников Белорусского Подвинья XIV–XVIII вв. и вопросы его интерпретации в свете данных археологии и этнографии / В. В. Черевко // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. по материалам Междунар. науч. конф., Пинск, 21–22 окт. 2016 г. – Пинск : Полес. гос. ун-т, 2016. – С. 6–9.

УДК 001(091)(082)
ББК 72.3я431
И 32

*Рецензенты:*

заведующий кафедрой гуманитарных наук УО «Брестский государственный технический университет», кандидат исторических наук, доцент
**А.В. Мощук**

доцент кафедры историко-культурного наследия УО «Полесский государственный университет», кандидат исторических наук, доцент
**И.Э. Еленская**

*Редакционная коллегия:*

кандидат исторических наук **Е.А. Бурик**
доктор исторических наук, профессор **А.Н. Вабищевич**
кандидат исторических наук, доцент **Е.И. Пашкович**
кандидат исторических наук, доцент **Е.С. Розенблат**
доктор исторических наук, доцент **И.И. Шевчук**

И 32 **Из истории** науки Беларуси: к 25-летию исторического факультета БрГУ имени А. С. Пушкина : сб. материалов междунар. науч.-практ. конф., Брест, 25–26 нояб. 2016 г. В 2 ч. Ч. 1 / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: Е. А. Бурик [и др.]. – Брест : БрГУ, 2018. – 284 с.

ISBN 978-985-555-740-2 (ч. 1).
ISBN 978-985-555-739-6.

В материалах сборника исследователями Беларуси, Украины, России, Польши, Литвы рассмотрены проблемы международных отношений, межнациональной и конфессиональной политики, проблемы историографии, современные проблемы гуманитарного образования и геополитики.

Издание адресовано научным работникам, ученым, преподавателям и студентам вузов, а также всем, кто интересуется актуальными проблемами исторической науки.

**УДК 001(091)(082)**
**ББК 72.3я431**

**ISBN 978-985-555-740-2 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-555-739-6**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2018

## СОДЕРЖАНИЕ

**Раздел 1. ИСТОРИЯ НАУКИ** ........ 6
**Бурик Е.А.** Исторический факультет БрГУ имени А.С. Пушкина: этапы становления и развития ........ 6
**Вабішчэвіч А.М.** Гістарычны факультэт БрДУ імя А.С. Пушкіна: навуковы патэнцыял і перспектывы яго развіцця ........ 14
**Никитенкова Л.П., Хомич А.Э.** Научно-исследовательская работа преподавателей и студентов БГПИ имени А.С. Пушкина в 70-е гг. XX в. ........ 18
**Борисенко В.В.** Становление и развитие исторического образования и науки в МГУ имени А.А. Кулешова ........ 22
**Кушпетюк О.І.** Форми роботи перших музеїв Волинської губернії щодо висвітлення минувшини краю ........ 30
**Глинка В.С.** К вопросу о научно-исследовательской работе вузовских историков в Беларуси в 1985–2000 гг. ........ 35
**Улейчик Н.Л.** Факультет истории, коммуникации и туризма Гродненского государственного университета имени Янки Купалы: опыт истории и взгляд в будущее ........ 40
**Дубінін Д.У.** Развіццё гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ........ 48
**Слешиньский В.** Konstruowanie przekazu historycznego w BSSR ........ 55
**Каспяравичюс А.П.** Состояние, разработки и тенденции развития исторической науки Литвы начала XXI в. ........ 60
**Глеб М.В.** Белорусско-китайские научные связи (конец 1950-х – начало 1960-х гг.) ........ 66

**Раздел 2. ЛИЧНОСТЬ В ИСТОРИИ. МЕЖНАЦИОНАЛЬНЫЕ ОТНОШЕНИЯ** ........ 75
**Ковалева Н.Н.** М.В. Довнар-Запольский: новый взгляд на проблемы экономического развития Беларуси ........ 75
**Бундак О.А.** Антон Петрович Щербак: штрихи до портрета ........ 79
**Лишик В.В., Рыков Н.А.** Наследие рода Немцевичей в истории Брестчины ........ 86
**Райчонак А.А.** Праблема нацыянальнага самавызначэння Беларусі ў перыяд паміж рэвалюцыямі 1917 г. ........ 89
**Борисенок Е.Ю.** Проблема национальной культуры в коренизации 1920-х гг. (на примере УССР) ........ 94
**Грибова С.В.** Переплетение исторических судеб белорусских татар и евреев в годы Великой Отечественной войны ........ 100
**Галимова Н.П.** В.И. Пичета – создатель классического университета в Беларуси ........ 104
**Акинчиц И.И., Предко Т.И.** Национальная идея – ядро национального самосознания ........ 108
**Семенчик Н.Е.** Отношение жителей Беларуси к войне (1914–1918 гг.) ........ 114
**Місіюк В.С.** Етнолінгвістичні групи Західного Полісся ........ 122

**Раздел 3. БЕЛАРУСЬ В ИСТОРИОГРАФИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЯХ. ИСТОЧНИКИ** ........ 130
**Рэут У.Р.** Гістарычныя крыніцы па інвентарнай рэформе ў Беларусі (1844–1857 гг.) ........ 130
**Свентуховская Г.В.** Развитие медицины в Полесском воеводстве в 1921–1939 гг.: историография вопроса ........ 137
**Савіч А.А.** Матэрыялы Камінтэрна як крыніцы па гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. ........ 143
**Милач Т.М.** Процесс построения белорусской государственности в 1917–1922 гг. в оценке Янки Купалы ........ 149
**Гуринович Л.М.** Современная украинская историография «истории повседневности» Великой Отечественной войны ........ 152
**Бодак А.Ю.** Связь и печать в Ганцевичском районе в 1940–1941 гг. ........ 156
**Чараўко В.У.** Кераміка познесярэднявечнага могільніка Доўгае як сведчанне памінальнага абраду ........ 160
**Крапивин В.С.** Люстрация казенных земель в Беларуси органами госимуществ (1863–1873 гг.) ........ 163
**Занько Е.Ю.** Основные формы и методы идеологической работы в западных областях БССР в послевоенный период (1944–1950-е гг.) ........ 168
**Вальчук О.І. , Мельничук О.А.** Запровадження соціального страхування в БСРР у 1920-х рр. ........ 174
**Бригадин Д.П.** Особенности городской преступности в Беларуси в конце XIX – начале XX в. ........ 179
**Мізярска Н.А.** Дабрачынная і асветніцкая дзейнасць шляхты Лепельскага павета ў XIX – пачатку XX ст. ........ 185

**Раздел 4. ГЕОПОЛИТИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ. КОНФЕССИОНАЛЬНАЯ ИСТОРИЯ** ........ 188
**Скакун Е.В., Тарский А.А.** Культурный аспект глобализации ........ 188
**Кавецкий С.Т.** Углубление неравенства – глобальное противоречие мироустройства ........ 193
**Змитрович И.О.** Косовский кризис конца XX – начала XXI в. с позиций социологии конфликтов ........ 197
**Зубрицкий В.А.** Военно-стратегические последствия воссоединения Западной Беларуси ........ 203
**Сыцько К.В.** Тэарэтычныя аспекты канфесійнага крыніцазнаўства ........ 207
**Северин Э.Н.** Этапы развития конфессиональной политики Беларуси ........ 214
**Коханова В.И.** История развития местечка Богушевское с 1879 по 1991 г. ........ 217
**Чуль Р.В.** Роль православного духовенства в организации и проведении благочиннических крестных ходов на территории Беларуси в начале XX в. ........ 220
**Васюк Г.В.** Католические традиции на Гродненщине в 90-е гг. XX – начале XXI в. ........ 223
**Харичкова Л.В.** Религиозная политика Константина I (306–324 гг.) ........ 229

**Раздел 5. ПРОБЛЕМЫ ГУМАНИТАРНОГО ОБРАЗОВАНИЯ**....................236
**Острога В.М.** Образовательные экскурсии и поездки учителей Беларуси (начало XX в.)....................236
**Жук Г.В.** Волонтерство как проявление гражданской позиции студенчества..........243
**Калиновская И.П.** Самостоятельная работа как средство формирования компетенций студента-историка....................246
**Кузьмич В.Н.** Опыт и перспективы использования проектного метода в практике изучения истории....................249
**Варич В.Н.** Гуманитарное образование в современном белорусском вузе........258
**Варабей Т.П.** Тэарэтычнае асэнсаванне «віленскага барока» ў мастацтвазнаўстве 1920–1930-х гг....................264
**Ушылава Т.В.** Стварэнне і дзейнасць дзяржаўных органаў аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі (1920-я гг.)....................273
**Крывалап А.Д.** Культурная ідэнтычнасць як медыяпраект....................277
**Ятусевіч С.С.** Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці сучаснай моладзі....................282